## Ведамасці аб этнаграфічным складзе насельніцтва Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага ўездаў Гродзенскай губерні за 1906 год

У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродне захоўваецца вялікая колькасць аўтэнтычных матэрыялаў па гісторыі Беласточчыны XIX — пачатку XX ст.ст. Задача сучасных даследнікаў — выяўленьне і вывучэньне іх, а таксама ўвядзеньне найбольш цікавых у навуковы ўжытак. Чытачам „Беларускага гістарычнага сшытка” прапануецца адзін з такіх матэрыялаў: „Переписка с генерал-губернатором Северо-Западного края с уездными предводителями дворянства о введении в действие разрешения о преподавании польского и литовского языков в Северо-Западном крае. Ведомости этнографического состава населения Гродненской губернии по уездам. Май 1906 — 4 декабря 1919 гг. На 243 листах” (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 18, ад. зах. 1097). Гэты комплекс дакументаў — вынік пэўных дэмакратычных пераўтварэнняў у Расійскай імперыі ў пач. XX ст., рэакцыя на сацыяльныя катаклізмы.

Прапанаваныя „ведамасці этнаграфічнага складу насельніцтва” трох уездаў Гродзенскай губерні (Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага) займаюць сяэдняе месца паміж I расійскім перапісам насельніцтва 1897 г. і I перапісам насельніцтва 2-й Рэчы Паспалітай 1921 года і з’яўляюцца арыгінальнай крыніцай. Яны ўтрымоўваюць разнастайную статыстычную інфармацыю аб этнічным і рэлігійным складзе насельніцтва, аб развіцці асветы, аб дэмаграфічнай сітуацыі на Беласточчыне перад I сусветнай вайной.

Сам працэс пэўнай дэмакратызацаі асветы ў пач. XX ст. для розных народаў праходзіў па-рознаму. Напрыклад, для палякаў і лі-

тоўцаў дазвалялася нацыянальная мова (толькі ў пачатковых школах пры выкладанні самой мовы, закону Божага ды падстаў арыфметыкі), беларусам гэтак не пашчасціла. Прычым расійскія ўлады рабілі ўсё магчымае, каб абмежаваць тэрыторыю выкарыстоўвання родных моў.

Адносна ўвядзення польскай мовы ў пачатковых школах на тэрыторыі Гродзенскай губерні, якая мяжуе з Царствам Польскім, было прынята рашэнне аб стварэнні асобых мясцовых этнаграфічных экспедыцый. Кіраваць імі былі прызначаны ўездныя „предводители” дваранства, а складаліся з прадстаўнікоў вучэбнага ведамства, земскіх начальнікаў і мясцовых людзей, якія карысталіся даверам. Сярод апошніх былі настаўнікі некаторых школ. Галоўнай мэтай гэтых экспедыцый з’яўлялася дакладнае высвятленне этнаграфічных межаў суцэльнага рассялення несельніцтва, прыроднай мовай якога неабходна лічыць польскую. Анкетаванне вылучаных тэрыторый праводзілася па агульнай схеме: 1) назва населенага пункта; 2) якой воласці; 3) колькасць жыхароў; 4) колькасць жыхароў па нацыянальнасцях; 5) колькасць жыхароў па веравызнанні; 6) штодзённая мова ў хатнім ужытку (бацькоў з дзецьмі); і колькасць асобаў кожнай групы; 7) ці ёсць школа, і якая; 8) колькасць вучняў асобна па хлопчыках і дзяўчынках; 9) колькасць дзяцей школьнага ўзросту, асобна па хлопчыках і дзяўчынках з указаннем узросту; 10) калі няма мясцовай школы, куды пасылаюцца дзеці ў школу.

Да 13 жніўня 1906 года здабытыя статыстычныя і этнаграфічныя даныя па Беластоцкаму, Бельскаму і Сакольскаму ўездах былі перададзены ў Гродзенскае „Совещание”, спецыяльны орган, які збіраў матэрыялы і па іх прымаў пастановы. Як адзначалі грозенскія чыноўнікі ў прадстаўленні Віленскаму, Ковенскаму і Гродзенскаму генерал-губернатару К. Кржывіцкаму, „даныя ўездных камісій адносна складу насельніцтва трох абследаваных уездаў Гродзенскай губерні ўвогуле пацверджаюць статыстычные звесткі апошняга перапісу 1897 года...” Аднак справядліва было прызнана, што гэтыя даныя не могуць лічыцца безумоўна дакладнымі. У першую чаргу, ўся складанасць пытання заключалася ў правільным вызначэнні народнасці. Больш дакладнае вызначэнне народнасці магчыма акрэсліць толькі навуковымі спосабамі. Уездныя ж камісіі карысталіся ў асноўным паняццямі, распаўсюджанымі сярод мясцовага насельніцтва, паводле якіх прыналежнасць да пэўнай народнасці блыталася з вызнаннем канфесіі (БДГА, ф. 1, воп. 18, ад. зах. 1097, л. 128).

Безумоўна, расійскія чыноўнікі і настаўнікі рабілі ўсё магчымае, каб максімальна зменшыць тэрыторыю выкарыстоўвання польскай мовы ў сістэме адукацыі. З гэтаю мэтаю, напрыклад, было праве-

дзена паўторнае анкетаванне Дайлідскай, Юхнавецкай, Харашчанскай, Беластоцкай, Абрубнікаўскай, Прытулянскай і Ясвільскай валасцей Беластоцкага ўезда. Губернскаму кіраўніцтву не імпанавала вялікая колькасць польскага насельніцтва на гэтых тэрыторыях. А з другога боку, менавіта ў вышэйназваных валасцях абследаванні не былі праведзены на месцах, а даныя Беластоцкая камісія атрымала ад земскіх начальнікаў, уезднага іспраўніка і інспектара народных вучылішчаў.

У рэшце рэшт Гродзенскім асобым „совещанием" па матэрыялах, прадстаўленых уезднымі камісіямі, было вызначана:

1. У Сакольскім уездзе польскае насельніцтва сустракаецца толькі нязначнымі групамі, у так званых „ваколіцах", прычым насельніцтва карыстаецца пераважна беларускай мовай. Таму Сакольскі ўезд не быў уключаны ў лік мясцовасцей, дзе магчыма выкарыстоўваць польскую мову ў пачатковых школах.

2. Адносна Беластоцкага ўезда пасля паўторнай праверкі было прызнана, што польскае насельніцтва суцэльна пражывае толькі ў Крыпнянскай, Прытулянскай і паўночна-заходняй частцы Ясвільскай валасцей. Менавіта тут ёсць усе падставы для ўвядзення ў пачатковых школах польскай мовы.

3. Бельскі ўезд па складу насельніцтва падзяляецца на тры раёны: а) беларускі — воласці Дубяжынская, Арлянская, Новабярозаўская, Ласінская, Кленіцкая, Пасынкаўская, Аляксандраўская. Тут выкарыстоўваць польскую мову ў школах забараняецца; б) польскі — заходняя частка Райскай воласці, Малешэўская (за выключэннем паўднёвай часткі), Наройская (за выключэннем паўднёва-заходняй часткі) і Сямятыцкая (за выключэннем паўднёвай часткі). У гэтых мясцовасцях дазвалялася польская мова ў школах; в) трэці раён населены беларусамі, якія размаўляюць па-польску — Скурэцкая і большая частка Гарадзіскай воласці. Тут польская мова дазвалялася ў школах, калі гэтага жадала больш 50% мясцовага насельніцтва (БДГА, ф. 1, воп. 18, ад. зах. 1097. Л. 135-136 ад. 137-138).

Дакумент з назвай „Ведомости этнографического состава населения Гродненской губернии по уездам" выйшаў з імперскіх бюракратычных устаноў, таму патрабуе да сябе ўважлівага стаўлення даследнікаў. Наколькі карэктныя метады статыстычнага аналізу выкарыстоўваліся тагачаснымі сацыёлагамі і наколькі верагоднымі могуць быць вынікі іх працы можна будзе меркаваць пасля адпаведнага паглыбленага аналізу дадзенай крыніцы з боку сучасных даследнікаў.

**Генадзь Семянчук**
(Гродна)